тычна-акустычнага пункту гледжання адрозненне паміж К. і дысанансам толькі колькаснае (суадносіны лікаў ваганняў дысануючых інтэрвалаў утвараюць больш складаныя дробы), а мяжа паміж імі ўмоўная. У рамках мажорна-мінорнай сістэмы адрозненне паміж К. і дысанансам дасягае ступені вострай супрацьлегласці, кантрасту і валодае самаст. эстэтычнай каштоўнасцю.

*Н.В.Мацабярыдзэ.*

**КАНСАНАНСНАЯ РЫФМА**, к а н с а н а н с, від недакладнай рыфмы, у якой супадаюць толькі зычныя гукі («дом — дым», «кедр — кадр», «долы — дула»). Часам К.называюць дысанансам, паколькі націскныя галосныя ў ёй не супадаюць. Ва ўзбагачаным кансанансе у паслянаціскной пазіцыі могуць быць аднолькавымі і некаторыя галосныя гукі:

А ў нядзельку параначку
Ходзіць рэкрут па рыначку,
Бярэ віно-гарэлачку.
(Народная песня)

Рэдкі ў бел. паэзіі ўзор верша, які поўнасцю напісаны К.р., пакінуў У.Дубоўка («І чаму глядзіш так»):

Ты была другая.
Я — такі, як сёння.
Што ж: была і песня,
быў і звонкі смех.
І прайшло без следу,
знікла ўсё дазвання,
нават адгалосак
пралунаў і сціх.

*В.П.Рагойша.*

**КАНСАНАНТЫЗМ** (ад лац. consonantis зычны гук), 1) сістэма зычных фанем мовы, дыялекту або гаворкі на пэўным этапе развіцця. К. сучаснай бел. літ. мовы з'яўляецца вынікам працяглай эвалюцыі, сутнасць якой заключаецца ў паступовым павелічэнні складу фанем і ўзмацненні адрознівальнай функцыі зычных. У аснове класіфікацыі зычных бел. мовы ляжаць асобныя прыкметы артыкуляцыйныя (месца ўтварэння, спосаб утварэння) і акустычныя (суадносіны голасу і шуму). Паводле месца ўтварэння (артыкуляцыі актыўнага органа маўлення) зычныя бел. мовы падзяляюцца на губныя (утвараюцца пры збліжэнні ніжняй губы з зубамі ці верхняй губой: в, в', ф, ф'; б, б', п, п', м, м', ў) і язычныя (утвараюцца пры актыўным удзеле языка: д, т, дз, дз', дж, ж, ш, з, з', с, с', й, л, л', н, н', р, ц, ц', ч, г, г', ґ, ґ', к, к', х, х'). Паводле спосабу ўтварэння зычныя дыферэнцыруюцца на змычныя (узнікаюць пры поўным змыканні органаў маўлення — губ, языка і зубоў, языка і паднябення: б, б', п, п', д, т, ґ, ґ', к, к'), шчылінныя (вымаўляюцца пры збліжэнні актыўнага органа маўлення з пасіўным — языка з зубамі або паднябеннем, губ з зубамі: в, в', ф, ф', з, з', с, с', ж, ш, ў, г, г', х, х'), змычна-шчылінныя (утвараюцца, калі органы маўлення спачатку змыкаюцца, а затым плаўна размыкаюцца, утвараючы шчыліну: дж, дз, дз', ц, ц', ч), змычна-праходныя (пры вымаўленні адны органы маўлення змыкаюцца, а другія ўтвараюць праход для паветра: м, м', л, л', н, н'), вібрант (утвараецца ў выніку дрыжання ў поласці рота пярэдняй часткі спінкі языка: р). Паводле ўдзелу голасу і шуму адрозніваюць зычныя санорныя (голас пераважае над шумам: в, в', м, м', л, л', н, н', р, й, ў) і шумныя (складаюцца з голасу і шуму, але з перавагай шуму над голасам — звонкія: б, д, дж, ж, з і інш., або толькі з шуму — глухія: п, т, ч, ш, с і інш.). 2) Асаблівасці вымаўлення зычных у пэўных фанетычных умовах. К. процiпастаўляецца *вакалізму* — сістэме галосных фанем.

*Літ.*: Фанетыка слова ў беларускай мове. Мінск, 1983; К р ы в і ц к і А.А., П а д л у ж н ы А.І. Фанетыка беларускай мовы. Мінск, 1984; Фанетыка беларускай літаратурнай мовы. Мінск, 1989; В э к с л е р П. Гістарычная фаналогія беларускай мовы. Мінск, 2004. *Д.В.Дзятко.*

**КАНСЕРВАТО́РЫЯ** (італьян. conservatorio прытулак ад лац. conservo захоўваю), вышэйшая музычная навучальная ўстанова, якая рыхтуе спе-